# Роднае слова

штомесячны навуковы і метадычны часопіс

11/2025
(455)
лістапад
ISSN 0234-1360

**Каласавіны – 2025**

- Да 100-годдзя выдання паэмы "Сымон-музыка": новае прачытанне і гісторыя перакладаў
- Індывідуальна-аўтарскія неалагізмы паэта ў перастварэнні на рускую мову
- Якуб Колас пад жартоўным прыцэлам мастакоў: у анталогію беларускага шаржу

**Асобы нумара:**

- Сяргей Палуян
- Ян Скрыган
- Андрэй Макаёнак
- Міхась Васілёк

# Змест


**ЛІТАРАТУРА І ЧАС**

**Міцкевіч Вера.** "Трэба чыстым быць душою…": экалогія душы ў паэме "Сымон-музыка" Якуба Коласа . . . . . . . . 3

**Міцкевіч Марыя, Шувагіна-Адамовіч Наталля.** Да гісторыі перакладаў паэмы "Сымон-музыка" Якуба Коласа . . . . . . . . 6

**Вабішчэвіч Таццяна.** Гімназічнае атачэнне Сяргея Палуяна ў Мазыры . . . . . . . . 9

**Трус Мікола.** Галасы і адгалоскі развітання з Сяргеем Палуянам у 1910 г. . . . . . . . . 14

**Жыбуль Віктар.** "Вітрына", якая не заззяла: Ян Скрыган пад псеўданімам *Янка Відук* . . . . . . . . 18

**Траццяк Зоя.** Працэс "белетрызацыі – дакументалізацыі" аповеду пра Першую сусветную вайну ў кнізе "Кругі" Яна Скрыгана . . . . . . . . 22

**Юркойць Дзмітрый.** Асаблівасці ідэйна-мастацкай эвалюцыі творчасці Міхася Васілька . . . . . . . . 25

**Міховіч Ульяна.** Ліст Алега Жылуновіча (сына Цішкі Гартнага) з блакаднага Ленінграда: *Лісты на шляхах Перамогі* . . . . . . . . 28

**Самахвалаў Дзмітрый.** Шматгранная спадчына Міхайлы Грамыкі: *Асоба на архіўных старонках* . . . . . . . . 30

**Шамякіна Марыя.** "Дыхайце эканомна": канспіралагічная камедыя Андрэя Макаёнка . . . . . . . . 31

**Бароўка Ванда.** Паспрабаваць раскрыць *lux veritatis*: Да 85-годдзя з дня нараджэння Кастуся Тарасава . . . 35

**МОВЫ РЫСЫ НЕПАЎТОРНЫЯ**

**Старасценка Таццяна.** Вышыні таленту Паўла Міхайлава . . . . . . . . 39

**Важнік Сяргей.** Запаветы Яўхіма Карскага . . . . . . . . 41

**Мантур Алена.** Стылістычныя трансфармацыі індывідуальна-аўтарскіх неалагізмаў Якуба Коласа ў перакладзе на рускую мову . . . . . . . . 44

**Багамолава Алена.** Мастацкае слова Андрэя Макаёнка на арбіце беларускай драматургіі і ў кантэксце п'есы "Выйгрыш" . . . . . . . . 47

**Іваноў Яўген.** "Як хораша гучыць – крылатае імя!": Іншамоўныя крылатыя ўласныя імёны ў беларускай мове . . . . . . . . 52

**Куліковіч Уладзімір, Хваленя Святлана.** Жанравы, тэматычны і моўна-стылістычны патэнцыял навукова-папулярных часопісаў . . . . . . . . 57

**МЕТОДЫКА І ВОПЫТ**

**Мартынкевіч Святлана.** Методыка напісання сачынення-апісання на прыкладзе апісання помніка гісторыі ў публіцыстычным стылі . . . . . . . . 60

**Несцер Святлана.** Урокі па арфаграфіі: Урок 2. Правапіс галосных *е, ё, я* (Х клас) . . . . . . . . 63

**Есіс Яўген.** Андрэй Макаёнак. Жыццяпіс і агляд творчасці. Трагікамедыя "Зацюканы апостал". Характарыстыка вобразаў-персанажаў: Урок беларускай літаратуры (ХІ клас) . . . . . . . . 66

**Бязручка Леанід.** Адметныя асобы кастрычніка і лістапада: жыццёвы шлях і творчасць: Інтэлектуальная гульня (X–XI класы) [Леў Клейнбарт, Сяргей Палуян, Міхась Васілёк, Ян Скрыган, Кастусь Тарасаў] . . . . . . . . 69

**НАЦЫЯНАЛЬНАЯ І СУСВЕТНАЯ КУЛЬТУРА**

**Шапран Сяргей.** Якуб Колас пад жартоўным прыцэлам мастакоў . . . . . . . . 72

**Горны Аляксандр, Калеснік Леанід.** Невядомыя творы Пётры Сергіевіча з Гродзеншчыны . . . . . . . . 76

**Рубашная Анастасія.** Гісторыя Дзяржаўнай карціннай галерэі БССР праз прызму даваеннай прэсы (1933–1941) . . . . . . . . 78

**Трапянок Уладзімір.** Унёсак айчынных пісьменнікаў у развіццё беларускага радыё ў 1925–2025 гг. . . . . . . . 83

**Харытонава Святлана.** Радыёвяшчанне для дзяцей і моладзі ў раннесавецкі перыяд . . . . . . . . 88

**Трубач Вольга.** Беларускае традыцыйнае вяселле праз прызму эмоцый яго ўдзельнікаў . . . . . . . . 90

**Казакова Ірына.** Кітайская традыцыйная культура . . . 94

***Каляндар памятных датаў і юбілейных дзён на 2025 год.*** Снежань (68, 77).

***Кола гадоў:*** Каляндар на 2026 год (96).



У адпаведнасці з заканадаўствам аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць прыведзеных у артыкуле фактаў і звестак.
Рэдакцыя пакідае за сабой права друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не падзяляючы пункту гледжання аўтара.
Пры перадруку спасылка на "Роднае слова" абавязковая.
Дасылаючы матэрыялы для публікацыі ў нашым часопісе, аўтары тым самым перадаюць выдаўцу невыключныя маёмасныя правы на ўзнаўленне, распаўсюджванне, паведамленне для ўсеагульнага ведама і іншыя магчымыя спосабы выкарыстання твора без абмежавання тэрыторыі распаўсюджвання (у тым ліку ў электроннай копіі часопіса), а таксама даюць згоду на апрацоўку персанальных звестак.
Патрабаванні да афармлення матэрыялаў і ўмовы прыняцця матэрыялаў для аспірантаў гл. на сайце часопіса rod-slova.by.
Калі не пазначана іншае, то ілюстрацыйны матэрыял (фотаздымкі, графікі, табліцы, рэпрадукцыі) пададзены аўтарам / аўтарамі артыкула.
Паводле падатковага заканадаўства выдавецтва пры налічэнні ганарару падае звесткі пра даходы аўтараў незалежна ад факта атрымання грашовых сродкаў на рукі. Для таго каб ганарар не налічаўся, аўтар можа адмовіцца ад яго, прыклаўшы да матэрыялу, які дасылаецца ў рэдакцыю, заяву. Спампаваць заяву можна на сайце часопіса.

Аляксандр ГОРНЫ,
кандыдат гістарычных навук,
Леанід КАЛЕСНІК,
настаўнік гісторыі Вялікаэйсмантаўскай школы Бераставіцкага раёна

# НЕВЯДОМЫЯ ТВОРЫ ПЁТРЫ СЕРГІЕВІЧА З ГРОДЗЕНШЧЫНЫ



***Пётра Сергіевіч*. Партрэт невядомага.** 1970-я гг.

Вельмі часта сямейныя архівы і зборы захоўваюць таямніцы, недаступныя шырокай аўдыторыі. Нават блізкія сваякі той ці іншай асобы, ад якой засталіся ўнікальныя артэфакты, не ўяўляюць важнасці захаваных матэрыялаў і не ведаюць пра іх каштоўнасць для навукі ці мастацтва. Такое становішча можа прывесці да прагалу ў біяграфічных звестках гістарычнай асобы, немагчымасці аднаўлення твораў культуры і нават да іх паступовага знікнення. Разумеючы важнасць захоўвання культурнай спадчыны беларускага народа ў поўным аб'ёме, аўтары гэтага нарыса хацелі б звярнуць увагу на невядомыя партрэты аўтарства знакамітага беларускага мастака Петры Сергіевіча, што захаваліся ў зборах сям'і Марцінчыкаў як спадчына ад Мікалая Марцінчыка.

Мікалай Марцінчык нарадзіўся 3 снежня 1901 г. у вёсцы Кубельнікі Гродзенскага павета ў сялянскай сям'і. Пасля вяртання з бежанства часоў Першай сусветнай вайны ён скончыў у Гродне мясцовую прыватную рэальную гімназію (1921). Менавіта ў той перыяд у горадзе назіралася пашырэнне беларускай нацыянальнай актыўнасці, ствараліся розныя беларускія ўстановы, і гэта прывяло да знаёмства юнака з нацыянальным рухам. У тым жа годзе ён паступіў на медыцынскі факультэт Віленскага ўніверсітэта. Падчас вучобы ва ўніверсітэце малады чалавек далучыўся да дзейнасці Беларускага студэнцкага саюза, а ў 1924–1925 гг. нават узначальваў гэтую арганізацыю. У студэнцкія гады М. Марцінчык пачаў актыўна супрацоўнічаць з беларускай прэсай левaрадыкальнага кірунку ў якасці аднаго з рэдактараў. Гэтая праца дазволіла яму зблізіцца з вядомымі лідарамі беларускага руху ў тагачаснай Заходняй Беларусі, напрыклад з Б. Тарашкевічам, С. Рак-Міхайлоўскім і інш. Арганізацыяй, якой Мікалай Марцінчык аддаў большую частку сваёй маладосці, стала Таварыства беларускай школы (ТБШ). У 1926 г., яшчэ студэнтам, ён увайшоў у Галоўную ўправу ТБШ, дзе пасля заняў пасаду намесніка старшыні арганізацыі. На працягу наступных дзесяці гадоў М. Марцінчык браў актыўны ўдзел у жыцці таварыства: арганізоўваў новыя структурныя адзінкі, наведваў акруговыя ўправы, абараняў актывістаў перад польскімі ўладамі, аказваў фінансавую падтрымку. У міжваенны перыяд М. Марцінчык зрабіў значны ўнёсак у захаванне беларусамі нацыянальнай ідэнтычнасці ва ўмовах палітыкі паланізацыі, быў перакананым беларускім патрыётам, за што некалькі разоў праследаваўся польскімі ўладамі. Яго імя можна было сустрэць побач з імёнамі такіх вядомых дзеячаў беларускай культуры міжваеннай Заходняй Беларусі, як Рыгор Шырма, Ігнат Дварчанін, Сяргей Паўловіч і інш.

Можна меркаваць, што якраз у міжваенны перыяд у Мікалая Марцінчыка склаліся сяброўскія адносіны з беларускім мастаком Пётрам Сергіевічам (1900–1984), які ў той час пачаў актыўна развіваць сваю творчую дзейнасць у Вільні. П. Сергіевіч быў не толькі мастаком, але і актывістам беларускага нацыянальнага руху, уваходзіў у склад некаторых беларускіх арганізацый, удзельнічаў у розных культурна-асветніцкіх мерапрыемствах. Больш за тое, яго можна лічыць мастацкім летапісцам беларускага руху ў міжваеннай Заходняй Беларусі. Менавіта ў той час мастак стварыў шэраг партрэтаў вядомых беларускіх дзеячаў. Фактычна да смерці ў 1984 г. Пётра Сергіевіч падтрымліваў цесныя кантакты з многімі прадстаўнікамі творчай беларускай інтэлігенцыі, вёў з імі перапіску, маляваў для іх партрэты і іншыя палотны.



pawet.net

Мікалай Марцінчык у пасляваенны перыяд жыў у Гродне, працаваў лекарам у абласной клінічнай бальніцы. У 1970-я гг., верагодна, па яго просьбе, мастак Пётра Сергіевіч выканаў шэраг партрэтаў родных і блізкіх М. Марцінчыка. Сёння нельга дакладна сказаць, ці прыязджаў мастак у Гродна да гэтага дзеяча, ці пісаў партрэты па фотаздымках. Прынамсі дзве карціны са збору М. Марцінчыка былі зроблены дакладна па фота, бо людзі, намаляваныя на іх, на момант стварэння прац ужо не жылі. Пасля смерці Мікалая Марцінчыка партрэты захоўваліся ў яго нашчадкаў, мастацтвазнаўцы пра іх не ведалі.



***Пётра Сергіевіч*. Партрэт Тэклі і Міхаіла Марцінчыкаў.** 1970-я гг. (?)

Усяго ў зборах сям'і Марцінчыкаў намі на сёння выяўлена пяць партрэтаў аўтарства Пётры Сергіевіча ⚓. Гэта групавы партрэт бацькоў Мікалая Марцінчыка – Тэклі і Міхаіла, партрэты Любові Марцінчык (роднай сястры Мікалая), Кацярыны Марцінчык (жонкі Мікалая), Івана Марцінчыка (малодшага брата Мікалая, вучня Віленскай беларускай гімназіі, які ў 1930-я гг. перабраўся ў СССР), а таксама партрэт невядомага мужчыны. На адвароце партрэта Кацярыны Марцінчык ёсць подпіс "*П. Сергіевіч 1973 г.*". На астатніх творах аўтарскіх подпісаў пакуль не выяўлена, але мастацкі стыль П. Сергіевіча не выклікае сумнення. Аднаму з аўтараў гэтых радкоў жонка Мікалая Марцінчыка пацвердзіла: партрэт яго бацькоў быў створаны П. Сергіевічам. Праўда, у сямейным зборы не знойдзена партрэта самога Мікалая Марцінчыка, хоць цалкам імаверна, што такі партрэт быў створаны мастаком разам з іншымі.

Выяўленне невядомых раней твораў Пётры Сергіевіча надзвычай актуальнае ў гэтым годзе, калі адзначаецца яго 125-гадовы юбілей. Партрэты, напісаныя рукой беларускага мастака, узбагачаюць беларускую культурную спадчыну і пашыраюць нашы веды пра майстра і пра яго творчыя кантакты.

*Заканчэнне. Пачатак на с. 68.*

**21 снежня** – 135 гадоў з дня нараджэння Мікалая Аладава (1890–1972), кампазітара, педагога, народнага артыста Беларусі

100 гадоў з дня нараджэння Валянціны Краўчанкі (1925–1984), актрысы

**22 снежня** – 75 гадоў з дня нараджэння Мікалая Байрачнага, мастака

**23 снежня** – 100 гадоў з дня нараджэння Віталя Катаева (1925–1999), дырыжора, педагога

90 гадоў з дня нараджэння Алы Грыбавай, мастачкі

75 гадоў з дня нараджэння Алы Мацюшэўскай, мастачкі, мультыплікатара

**24 снежня** – 115 гадоў з дня нараджэння Уладзіміра Глыбіннага (сапр. Сядура; 1910–1995), празаіка, літаратуразнаўцы, мастацтвазнаўцы

**25 снежня** – 140 гадоў з дня нараджэння Вячаслава Селяха (Селяха-Качанскага; 1885–1976), спевака, педагога

125 гадоў таму адкрыта Мінская абласная бібліятэка імя А. С. Пушкіна

**26 снежня** – 115 гадоў з дня нараджэння Марыі Бярковіч (1910–1993), мастачкі

90 гадоў з дня нараджэння Клаўдзіі Старыкавай, спявачкі

**27 снежня** – 130 гадоў з дня нараджэння Канстанціна Арбеніна (Максімовіча; 1895–1966), рэжысёра

**28 снежня** – 115 гадоў з дня нараджэння Івана Шацілы (1910–1977), акцёра, народнага артыста Беларусі

100 гадоў з дня нараджэння Анатоля Кісялеўскага (1925–1986), мовазнаўцы

75 гадоў з дня нараджэння Барыса Малахава, мастака

**29 снежня** – 75 гадоў з дня нараджэння Ірыны Стальной, мастацтвазнаўцы

**30 снежня** – 90 гадоў з дня нараджэння Нінэлі Жыжаль, мастачкі

90 гадоў з дня нараджэння Анатоля Ільінова (1935–2020), мастака

**31 снежня** – 145 гадоў з дня нараджэння Антона Баначыча (1880–1933), спевака, педагога

100 гадоў з дня нараджэння Ніны Равінскай (1925–2006), артысткі аперэты

90 гадоў з дня нараджэння Клары Малышавай, артысткі балета, педагога, народнай артысткі Беларусі

* * *

35 гадоў таму створаны Рэспубліканскі тэатр беларускай драматургіі

*Паводле звестак Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва.*







***Пётра Сергіевіч.***
**Партрэт Івана Марцінчыка.** 1970-я гг.

**Партрэт Любові Марцінчык.** 1970-я гг.

**Партрэт Кацярыны Марцінчык.** 1973 г.